Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



Маргарыта Аляшкевіч
Мінск

# Стратэгіі поспеху ў беларускай літаратурнай крытыцы

*Success strategies in Belarusian literary criticism*

Адной з тэндэнцый развіцця літаратурнай крытыкі на постсавецкай прасторы з'яўляецца паступовае ўключэнне крытыкі ў рынкавыя механізмы рэгулявання літаратурнага працэсу – у прыватнасці, у рэкламаванне і прамоцыю літаратурнай прадукцыі. На Беларусі гэты працэс ускладняецца частковым захаваннем дзяржаўнага кіравання літаратурным працэсам, аднак дэцэнтрацыя літаратурнага жыцця і маргіналізацыя літаратуры робяць падобнае кіраванне малаэфектыўным і пакідаюць месца для рынкавай самарэгуляцыі. Таму лічым мэтазгодным выкарыстоўваць пры даследаванні беларускай літаратурнай крытыкі першай дэкады XX ст. такія элементы маркетынгавага катэгарыяльна-паняційнага апарату, як *стратэгіі поспеху, рэсурсы, капітал, сегментацыя аўдыторыі, пазіцыянаванне* і некторыя іншыя, з адпаведным удакладненнем іх сэнсавага напаўнення ў галіне крытыкі. У той жа час, крытычнае выступленне з'яўляецца камунікатыўным актам, што патрабуе разгляду крытычных стратэгій як камунікатыўных, з прыцягненнем адпаведнай тэрміналогіі з галіны тэорыі камунікацыі. Нарэшце, кантэкст (запаўненне літаратурнага рынку Беларусі расійскай прадукцыяй, прэваляванне рускамоўных выданняў і чытачоў) патрабуе ўдакладнення катэгорыі „поспех" у беларускай літаратурнай крытыцы, дзе гаворка можа весціся не столькі аб прыбытковай і паспяховай літаратурна-крытычнай кар'еры (што лагічна было б лічыць рэалізацыяй стратэгіі поспеху), колькі аб пэўных „стратэгіях выжывання" крытыкі і літаратуры ў часова неспрыяльных варунках.

З улікам прыведзеных акалічнасцяў, разгледзім аўтарскія стратэгіі беларускіх літаратурных крытыкаў, скіраваныя на дасягненне поспеху, пад якім будзем разумець аптымальнае ператварэнне рэсурсаў у капітал. Поспех класіфікуем як індывідуальны (рэсурсы крытыка ствараюць капітал крытыка) і ідэальны (капітал крытыка ў якасці рэсурса грамадства спрыяе павелічэнню капітала грамадства). Спынімся на індывідуальным поспеху як неабходным складніку поспеху ідэальнага.

У крытыцы рэсурсы – гэта талент, працаздольнасць, прафесійная кампетэнтнасць крытыка. У крытычным капітале варта вылучыць яго сімвалічны і матэрыяльны кампаненты: сімвалічны ўключае рэпутацыю, сацыяльны статус

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



крытыка, уплыў на літаратурны працэс (і іншыя складнікі і праявы сімвалічнай улады); матэрыяльны ўключае ганарары, прэміі, стыпендыі, выданне кніг і інш.

Увогуле стратэгія вызначаецца як пакрокавае планаванне дасягнення мэты з улікам сродкаў для кожнага кроку.[1] Стратэгіі крытыкаў вылучаюцца намі з сукупнасці тэкстаў і медыйных паводзін пэўнага крытыка на падставе правіл, арганізацыйных рэсурсаў і паслядоўнасці камунікатыўных дзеянняў, якіх гэты аўтар прытрымліваецца.

Паводле класіфікацыі камунікатыўных стратэгій, якую прапанаваў украінскі даследчык Сяргей Дацюк[2], вылучаюцца: 1) маніпулятыўныя і неманіпулятыўныя, 2) канвенцыйныя і канфліктныя статэгіі.

Крытычныя стратэгіі найчасцей з'яўляюцца маніпулятыўнымі – ажыццяўляюць захоп сэнсавай прасторы камунікацыі, фарміруюць у іншых удзельнікаў камунікацыі сваё бачанне рэальнасці. Заўважым, што маніпуляцыя найчасцей не мае адносін да маральнага выбару альбо злых намераў крытыкаў. Маніпуляцыя адбываецца, калі адзін бок камунікацыі (крытык) мае стратэгію, а іншы (чытач) не мае; альбо калі ў выніку барацьбы стратэгій адна (крытычная) паглынае іншую (напрыклад, пісьменніцкую, іншага крытыка).

Разгледзім стратэгіі крытыкаў з дапамогай крытэрыяў хуткасці (Х) і доўгатэрміновасці (Д):

1) Х і не-Д: стратэгіі рызыкі (умоўная адпаведнасць: канфліктная стратэгія)

2) Не-Х і Д: стратэгіі грунтоўных рашэнняў (канвенцыйная)

Варыянт „не-Х і не-Д" не з'яўляецца, на нашу думку, асэнсаванай стратэгіяй. Варыянт „Х і Д" з'яўляецца ўласна стратэгіяй поспеху, якая ўключае элементы 1 і 2 стратэгій.

Удакладнім катэгорыю хуткасці як высокага тэмпу ўваходжання ў літаратурны працэс, фарміравання літаратурнай рэпутацыі, медыйнага вобразу крытыка – „стартавага капіталу".

**Стратэгія рызыкі**

Крытычная стратэгія рызыкі ўяўляе сабой двухкрокавую стратэгію, якая ўключае:

1) захапленне ўвагі (уваходжанне крытыка ў медыйную прастору);

2) мадэраванне рэакцыі, прырашчэнне сэнсаў (замацаванне крытыка ў медыйнай прасторы, фарміраванне медыйнага вобразу).

Сродкамі першага кроку з'яўляюцца правакацыя і такія яе складнікі, як эпатаж і скандал.

1 *Современный философский словарь*, под общ. ред. В. Е. Кемерова–Лондон–Франкфурт-на--Майне–Париж–Люксембург–Москва–Минск 1998, с. 865.

2 С. Дацюк, *Коммуникативные стратегии модерируемых коммуникаций*, [в:] *Культурные провокации* [Электронны рэсурс]. 1999. Рэжым доступу: http://xyz.org.ua/~_xyz/moderation.html, дата доступу: 09.08.2012; С. Дацюк. *Коммуникативные стратегии*, Сетевой журнал „XYZ" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: http://xyz.org.ua/discussion/communicative_strategy.html, дата доступу: 09.08.2012.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



Сродкам другога кроку з'яўляецца публічная дыскусія, падчас якой у залежнасці ад прыроды стратэгіі, абранай крытыкам, а таксама яе адпаведнасці грамадскай сітуацыі адбываецца абвастрэнне канфлікту пазіцый або дасягненне кансенсусу (кампрамісу). Значны ўплыў на другім кроку аказвае выбар крытыкам медыйнага сродку: друкаваныя перыядычныя выданні дазваляюць большую ступень мадэрацыі і большую аўтарытэтнасць выказванняў удзельнікаў дыскусіі, чым інтэрнэт-рэсурсы; у той жа час, інтэрнэт-рэсурсы дазваляюць большую свабоду выказвання, шырэйшую палітру ацэнак, яскравейшае праяўленне эмацыйных кампанентаў.

Пад **правакацыяй** разумеем камунікатыўную тэхніку стварэння канфлікту пазіцый. Правакацыйны крытычны выступ імкнецца выклікаць рэзкую рэакцыю іншых удзельнікаў камунікацыі, падштурхнуць да яе.

**Эпатажным** з'яўляецца такі крытычны тэкст, які імкнецца здзівіць сваёй незвычайнасцю, стварыць сітуацыю скандалу, у тым ліку з дапамогай адпаведных медыйных паводзін аўтараў крытычных тэкстаў.

**Скандал** у крытыцы вызначым як тэкст, які ганьбіць/знеслаўляе кагосьці з удзельнікаў літаратурнага працэсу (і самога аўтара крытычнага тэксту), выклікае ў чытачоў пачуццё няёмкасці, абурэння. Скандальная стылістыка пераймае сварку з крыкамі, лаянкай і пад. У залежнасці ад абранага сродку першага кроку магчымы розныя тыпы рэакцыі на другім кроку: дыскусія, водгук, водгук-„крыўда".

**Сродкамі правакацыі** ў крытыцы выступаюць: крытычная рэдукцыя, парушэнне крытычнай канвенцыі, эмацыйныя ацэнкі.

Пад рэдукцыяй маем на ўвазе наўмыснае звужэнне крытычнага зроку для канцэнтрацыі ўвагі на пэўнай праблеме альбо яе аспекце. Найбольш часта сустракаюцца наступныя правакацыйныя **рэдукцыі**:

• Катэгарычнасць/маналагічнасць выступу (выключэнне магчымасці іншых тлумачэнняў, пярэчанняў);

• Завастрэнне важнага (крытыку) за кошт элімінацыі дэталяў (магчыма скажэнне агульнай карціны, што часта выклікае абвінавачванні крытыка-правакатара ў непрафесіяналізме).

У якасці прыкладаў удалай крытычнай правакацыі за кошт рэдукцыі выкарыстаем першыя артыкулы найбольш значных, на наш погляд, дыскусій XX ст.

1. Вацлаў Ластоўскі *Сплачвайце доўг* (1913 г., „Наша Ніва"[3]) – неабходнасць выпрацоўкі філасофскай канцэпцыі беларускага мастацтва, нацыянальных культурных арыенціраў абумовіла правакацыйныя рэдукцыі: так, В. Ластоўскі папракае беларускіх літаратараў за аднастайнасць тэм і вобразаў, песімістычныя матывы, у той час як у літаратурным працэсе ўжо наяўныя паэмы Янкі Купалы *Сон на кургане*, *Курган*, яго камедыя *Паўлінка*, а таксама пейзажная, інтымная, філасофская лірыка Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна і іншых.[4]

[3] В. Ластоўскі, *Сплачвайце доўг*, [у:] В. Ластоўскі, *Выбраныя творы*, укл., прадмова і камент. Я. Янушкевіча, Мінск 1997, с. 273–275.

[4] П. Абрамовіч, *Дубавец і Ластоўскі. Чаму ўдалася першая і не ўдалася апошняя літаратурная дыскусія XX стагоддзя*, „ARCHE-Скарына". [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/6–2000/abram600.html, дата доступу: 22.04.2009.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



2. Сяргей Дубавец *Ружовы туман. Раздзел з гісторыі таталітарызму* (1998 г., „Літаратура і мастацтва"[5]) – неабходнасць новай ацэнкі беларускай савецкай літаратуры выклікала наступнае выказванне рэдукцыйнага характару: „Нічога не вылушчыш з кніг Броўкі, Глебкі і нават яшчэ блізкіх Мележа, Танка […] Там паўсюль ёсць або няпраўда, або метастазы сатанізму, ачалавечвання бесчалавечнасці". Рэдукцыя выяўляецца найбольш яскрава пры супастаўленні прыведзенага выказвання з эсэ *Энігма* (1993 г.), у якім С. Дубавец выказаў супрацьлеглую думку пра творчасць Максіма Танка: „[…] Танк — не ад д'ябла. У ім не знойдзеш нічога прынцыпова нездаровага. […] Паэт узроўню Купалы й Багдановіча"[6].

В. Ластоўскі і С. Дубавец дасягнулі мэты, якая апраўдала сродкі: артыкулы *Сплачвайце доўг* і *Ружовы туман* прыцягнулі ўвагу грамадскасці, а дыскусіі вакол іх сталі культурнай падзеяй.

Пад крытычнай **канвенцыяй** маем на ўвазе прынятыя правілы, законы пэўнай сістэмы (усталяваных жанраў, метадалогіі аналізу, камунікацыі ўнутры схемы аўтар-крытык-чытач і г. д.). Малыя парушэнні канвенцыі адбываюцца пастаянна, што забяспечвае дынамізм і развіццё сістэмы і можа разглядацца як частка канвенцыі. Для правакацыі неабходна парушэнне рэзкае або ўяўна рэзкае.

Сённяшняя пашыранасць і дэвальвацыя крытычнай правакацыі абумоўлена, з аднаго боку, вонкавай простасцю стратэгіі (з-за чаго правакацый стала шмат), а з другога боку, ускладненнем масавай камунікацыі (у якой другі крок стратэгіі – мадэраванне рэакцыі – робіцца фактычна немагчымым). Дэвальвацыя праяўляецца ў безвыніковасці альбо адсутнасці другой стадыі (публічнай дыскусіі). Паколькі прыкладаў крытычнай правакацыі надзвычай багата, структуруем іх паводле спосабу **парушэння канвенцыі**:

1) прадмет аналізу (перамяшчэнне ўвагі з тэксту на асобу яго аўтара): акцэнтуалізацыя гендэрнай прыналежнасці аўтараў крытычных тэкстаў у артыкулах Сяргея Грышкевіча[7], Міхася Южыка[8], абмеркаванне «пакрыўджаным» пісьменнікам

[5] С. Дубавец, *Ружовы туман. Раздзел з гісторыі таталітарызму*, „Літаратура і мастацтва" 1998, 9 студзеня, с. 5.

[6] С. Дубавец, *Энігма*, [у:] С. Дубавец, *Дзёньнік прыватнага чалавека. Апавяданьні, імпрэсіі, эсэ 1989–1998 гг.*, „Фрагмэнты" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: ttp://old.knihi.com/frahmenty/dubaviec2.htm, дата доступу: 05.08.2012.

[7] С. Грышкевіч, *Жаночая крытыка*, „Літаратура і мастацтва" 2010, 23 ліпеня, с. 6: „Глядзіш, бывае, на мілыя, прыгожыя тварыкі дзяўчат-крытыкаў, што пазіраюць з партрэцікаў, зробленых падчас чарговай фотасесіі, і няўцямна пытаешся ў самога сябе: няўжо гэтыя гламурныя лэдзі насамрэч разбіраюцца ў літаратуры? Ім бы адзенне якое рэкламаваць на подыюмах…". Рэакцыя: А. Лапіцкая, *Ad hominem*, „Літаратура і мастацтва" 2010, 23 ліпеня, с. 6; С. Стэповіч, *Аналогія крытыка і „Жаночае пытанне"*, „Літаратура і мастацтва" 2010, 27 жніўня, с. 6; Ц. Чарнякевіч, *Спроба кропкі*, „Літаратура і мастацтва" 2010, 27 жніўня, с. 6.

[8] М. Южык, *Быць крытыкам – гэта што?* Блог М. Южыка [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://iuzhyk.livejournal.com/17463.html, дата доступу: 15.05.2008: „У нас ільвіная доля літаратурных крытыкаў – жанчыны. Тады як з-за асаблівасцяў псіха-фізіялогіі аб'ектыўным можа быць толькі крытык-мужчына. Гэта амаль аксіёма, пацверджаная гісторыяй. Усім памятная экстрэмалка Дзянісава-Якавенка, што праславілася герастратавай славай сваімі злос-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



асабістых якасцей ці жыццёвых абставін яго крытыка (Юрасём Пацюпам – Ганны Кісліцынай[9]; Ігарам Бабковым – Пётры Рудкоўскага[10]; Віктарам Карамазавым – Людмілы Рублеўскай[11], Міхасём Южыкам – Лады Алейнік[12]), ацэнка абставін жыцця і творчасці аўтара *Гамбурскага рахунку[13]*, аналіз перакананняў крытыка ў якасці

ныміі артыкуламі-аглядамі холдынгаўскіх часопісаў. Лада Алейнік у гэтым плане больш памяркоўная, таму і трымалася з аглядамі доўга. Яна проста не злы чалавек, хоць і мела сярод аўтараў сваіх любімчыкаў і „ворагаў народа". Цяпер мы бачым Жану Капусту. Таксама экстрэмалка з чорнымі акулярамі на сваім духоўным аблічы. […] [Псіхафізіялагічныя асаблівасці жанчын-крытыкаў, якія замінаюць іх прафесіяналізму:] Немагчымасць мысліць аналітычна, рабіць самастойныя высновы, адкрываць новае. Жанчына-крытыкі зазвычай адно паўтараюць вядомыя ісціны і «дакручваюць» ужо адкрытыя і раскручаныя мужчынамі-крытыкамі імёны. Тое самае няма геніяльных празаікаў сярод жанчын і быць не можа. З прычыны прыроднай эмацыйнасці і слабай аналітычнасці розуму".

9 Ю. Пацюпа, *Пра кавалерысцкі наезд на пісьменьніцкія хутары*, „ARCHE-пачатак" [Электронны рэсурс] 2006, № 11. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/2006–11/paciupa611.htm, дата доступу: 05.02.2007: „[…] ў крытыкесы такі манерны дыскурс: усім заўдаць на арэхі", „сп-ня Кісьліцына працуе ў манеры, якую называюць «меркавальная крытыка». Калі яна выносіць нейкія вэрдыкты, дык не падмацоўвае іх нічым, апрача ўласнае ўпэўненасьці. Хвосткія ацэны кампэнсуюць брак аргумэнтацыі. Бяда ня ў тым, што сп-ня Кісьліцына піша ў кавалерысцкім стылі. Бяда ў тым, што яна чытае ў тым жа кавалерысцкім стылі"; „дзіўная эўрыстычная ўстаноўка ў сп-ні Кісьліцынай: заміж таго, каб услухоўвацца ў цьверджаньні літаратараў, абагульняць іх, яна раздражняецца, саркастычна перасьміхае, павучае" і г.д.

10 П. Рудкоўскі, *„Хлопчык-ідыёт" сярод „сьмецьця" Гайдэгера, або Як Бабкоў пасунуўся да межаў абсурду*, „ARCHE-пачатак" 2007, № 1–2, с. 79–88: „[І. Бабкоў пра П. Рудкоўскага] „Як яны мяне дасталі, гэтыя маленькія хлопчыкі-ідыёты з шчырымі жлобскімі вачыма […]", „[П. Рудкоўскі І. Бабкову] „Вы як філёзаф-прафэсіянал даяце дрэнны прыклад мне, філёзафу-пачаткоўцу, апэруючы агрэсіўна-гістэрычнай мовай і мэтадычна абражаючы сваіх апанэнтаў".

11 В. Карамазаў, *Ізноў дзяльба кабанчыка? Альбо чаму я адмовіўся ад прэзентацыі свайго рамана на кніжным кірмашы і ад далейшага ўдзелу у літаратурным конкурсе імя Ежы Гедройца.* Блог Літаратурнай прэміі Гедройца [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://bellitaward.blogspot.com/2012/02/blog-post_9499.html, дата доступу: 15.02.2012: „[…] я прынёс кнігу Рублеўскай. Хай, думаю, чытае, але пры гэтым спытаў, як ёй, ідэалагічнаму супрацоўніку першай у краіне палітычнай газеты, якую называюць прэзідэнцкай, закрытай для тых, хто не падзяляе афіцыйную ідэалогію і палітыку, удаецца пісаць аб'ектыўна-ацэначныя рэцэнзіі на кнігі незалежных ад афіцыёзу пісьменнікаў, якіх дзяржава не падтрымлівае, не выдае, абвяшчае пісьменнікамі «сацыяльна нязначнымі», што азначае грамадству непатрэбнымі, магчыма, варожымі, чыніць над іх творчай грамадскай арганізацыяй, Саюзам беларускіх пісьменнікаў, судовыя працэсы з мэтаю яе ліквідацыі, і ці магу я ў гэтай сітуацыі, аўтар кнігі-самвыдата, спадзявацца на аб'ектыўнасць яе ацэнак, даўшы зразумець, што не чакаю ад яе аб'ектыўнасці".

12 М. Южык, *Лада Алейнік сарвалася са шпулек,* Блог М. Южыка [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://iuzhyk.livejournal.com/83489.html, дата доступу: 11.04.2010: „Лада, не сорамна біць ніжэй пояса? Ці, можа, мне распавесці пра тваю анкалогію? Якая хвароба сур'ёзнейшая, яшчэ пытанне […]".

13 М. Скобла, *Рыгор Сітніца: „Нацыянальнае хунвэйбінства трэба спыняць",* Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/transcript/24409938.html, дата доступу: 02.12.2011: „[…] мяне абражае і Бахарэвіч. І дарэчы, адкуль абражае? Добра абражаць, седзячы на грантах у Нямеччыне, і паказваць нам наша месца пад лаўкай".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



доказу яго некампетэнтнасці ў дыскусіі вакол рамана Леаніда Дайнэкі (*У пошуках жанру*/ *Чарнавік?..*/ *А крытык працуе з тэкстам*[14]) і інш.

2) нормы метадалагічныя (выкарыстанне замест літаратуразнаўчай метадалогіі іншых – журналісцкай, мастацкай, альбо фігураванне ў якасці крытыкі блог-допісаў асабістага характару): літаратурная журналістыка Асі Паплаўскай[15], Аляксандра Новікава[16], дыскусіі ў блогах Ганны Кісліцынай[17], Аксаны Бязлепкінай[18]; блог-допіс замест рэцэнзіі Марыі Мартысевіч: „[…] рэцэнзія беларускага крытыка на раман беларускага пісьменьніка – гэта такі закамплексаваны жанар, законы якога не дазваляюць сказаць проста і адкрыта: беларускі аўтар напісаў гаўно. У сапраўднай адмоўнай рэцэнзіі беларускага крытыка на раман беларускага пісьменьніка трэба мякка, ненавязьліва намякнуць, што кніга мае недахопы, а напрыканцы абавязкова знайсьці ў тэксьце нешта, за што можна пахваліць аўтара. Іначай у аўтара будзе дэпрэсія. І ён больш ніколі нічога не напіша па-беларуску. І таму беларуская літаратура сыйшла разьвівацца дэградаваць у ЖЖ. Дык вось, дарагая жэжэшка, Юры Станкевіч напісаў гаўно”[19];

3) нормы публічнай камунікацыі (выкарыстанне стылістыкі скандалу): найбольш яскравы і лаканічны прыклад сустракаем у рэпартажы-справаздачы М. Мартысевіч *Як мы замянялі крышнаітаў*: „Крытыкі, замест таго, каб аналізаваць творы, абмяркоўваюць, хто з кім пераспаў і хто ў якіх шмотках выступаў”[20];

Першыя тры спосабы найбольш уласцівы непрафесійнай крытыцы альбо яе імітацыі (тэрмін „прафесійны” выкарыстоўваецца намі ў значэнні прыналежнасці суб’екта дзейнасці да пэўнай прафесіі, калі адпаведная праца разглядаецца як асноўны род дзейнасці, а не ў значэнні авалодання высокай ступенню майстэр-

[14] Ц. Чарнякевіч, *У пошуках жанру*, „Літаратура і мастацтва” 2009, 30 студзеня, с. 7; М. Дубоўскі, *Чарнавік?..*, „Літаратура і мастацтва” 2009, 20 сакавіка, с. 6; Ц. Чарнякевіч, *А крытык працуе з тэкстам* „Літаратура і мастацтва” 2009, 20 сакавіка, с. 6.

[15] А. Паплаўская, *Лінней, бестыярый, кузуркі ды іншае…*, „Дзеяслоў” 2009, № 6 (43), с. 317–320; А. Паплаўская, *Леанід Дранько-Майсюк: „На сцэне трэба чытаць змястоўныя вершы, а не рваць газеты!”*, „Верасень” 2009, № 1, с. 149–156; А. Паплаўская, *Ірына Шаўлякова пра сучасны стан літаратуразнаўства і крытыкі*, „Сучасная літаратурная крытыка” (блог-суполка) [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://lit-krytyka.livejournal.com/4767.html, дата доступу: 11.01.2010; А. Паплаўская, *Простыя словы. Простыя назвы. Калонка Асі Паплаўскай*, „Літаратура і мастацтва” 2010, 22 студзеня, с. 7 і інш.

[16] Белорусский литературный портал [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.litkritika.by, дата доступу: 24.02.2012.

[17] Г. Кісліцына, *Пра „Птушак” Насты Манцэвіч і …* Блог крытыка [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://annahonda.livejournal.com/565855.html, дата доступу:05.09.2012.

[18] А. Бязлепкіна, *Віня-Пых, Карлсан і іншыя пачваркі* Блог [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://euga.livejournal.com/68794.html, дата доступу: 18.12.2007.

[19] М. Мартысевіч, *Любіць неграў – права підарасаў: вострасюжэтны пост-папярэджаньне*, Блог „Радыё Марыйка” [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://users.livejournal.com/maryjka_/715609.html, дата доступу: 17.07.2011.

[20] М. Мартысевіч, *Як мы замянялі крышнаітаў*, Блог на сайце газеты „Новы Час” [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://novychas.org/blogs/maryjka/, дата доступу: 24.06.2010.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



ства і кампетэнтнасці ў галіне) – найчасцей гэта водгукі „пакрыўджаных" крытыкам пісьменнікаў, каментарыі чытачоў, рэпартажы і справаздачы журналістаў, прытым большая верагоднасць з'яўлення падобных правакацый у інтэрнэце, які дазваляе большую вольнасць камунікацыі. У той жа час, недобразычлівая атмасфера, што ўсталёўваецца праз вялікую колькасць падобных правакацый у сеціве, адбіваецца на агульнай ацэнцы крытычнай дзейнасці. Наступныя тры віды парушэння канвенцыі часцей здзяйсняюцца прафесійнымі крытыкамі:

4) нормы цытавання („вырыванне з кантэксту", якое прыцягвае ўвагу працытаванага). Нормы цытавання (асабліва датычна навуковых крыніц) у беларускай літаратурнай крытыцы ўвогуле вытрымліваюцца слаба; аднак некаторыя адмысловыя парушэнні могуць уздзейнічаць правакацыйна: напрыклад, Сяргей Балахонаў падчас дыскусіі пра беларускі постмадэрнізм залічваў беларускіх пісьменнікаў да постмадэрністаў „як той казаў, *ад балды*. Проста вельмі карцела даведацца, як стануць яны рэагаваць на прыпісаную ім постмадэрнісцкасць"[21]);

5) нормы жанравыя (эсэізацыя, жанравая дыфузія). Жанравыя эксперыменты ўласцівы многім крытыкам і літаратуразнаўцам – згадаем спецыфічную пабудову (разгортванне сюжэтаў) эсэ Алега Лойкі[22], „парадаксальную логіку" І. Штэйнера[23]; „нетыповыя" тыпалогіі І. Шаўляковай[24], іншажанравыя „інкрустацыі" ў крытыцы П. Абрамовіча (анекдот, дакумент, дзённік)[25];

6) нормы аксіялагічныя (сутыкненне дамінуючай сістэмы каштоўнасцяў, якая прадугледжвае высокую вартасць сям'і, інтарэсаў грамадства, гістарычнага мінулага, размежаванне высокага і нізкага стыляў etc., з перыферыйнай, якая сцвярджае выключную каштоўнасць індывіда і яго інтарэсаў, адмаўляе кананізацыю мінулага, практыкуе змяшэнне стыляў etc.). Такая крытыка, апелюючы да светапоглядных катэгорый, атрымлівае найвышэйшы правакацыйны зарад: напрыклад, дыскусіі, выкліканыя артыкуламі Людмілы Сіньковай *Старая мар-*

---

[21] С. Балахонаў, *Entlarvung адзінокага ў пустэльні,* „ARCHE-пачатак" 2004, №4, с. 286–289.

[22] А. Лойка, *Загадкі і цуды натхнення,* „Полымя" 2007, № 5, с. 112–121; Лойка А, *Дзівосы прозы*, „Полымя" 2008, № 1, с. 114–142; Лойка А, *Таемнасцяў зорных працяг*, „Полымя" 2008, № 8, с. 145–181 і інш.

[23] І. Штэйнер, *Déjà vu, або Успамін пра Будучыню: літаратурна-крытычныя артыкулы*, Мінск 2003.

[24] І. Шаўлякова, *Кунсткамера: „Дзень сурка",* [у:] І. Шаўлякова, *Рэстаўрацыя шчырасці: літаратурна-крытычны канструктар*, Мінск 2005, с. 110–127: супастаўленне разнастайнай літаратурнай прадукцыі як экспанатаў местачковай кунсткамеры; І. Шаўлякова, *Правілы адасаблення* [у:] І. Шаўлякова, *Сапраўдныя хронікі Поўні: артыкулы і рэцэнзіі,* Мінск 2011, с. 157–163: тыпалогія пісьменнікаў паводле жыццёвых перспектыў, якія паўстаюць з іх твораў.

[25] П. Абрамовіч, *Хадановіч і „Люфтганза",* „ARCHE-пачатак" 2006, № 12, с. 50–52; П. Абрамовіч, *Антычны дзённік,* „ARCHE-пачатак" 2005, № 3, с. 176–180; П. Абрамовіч, *Больш, чым сшытак,* „ARCHE-пачатак" 2006, №10, с. 235–240; П. Абрамовіч, *Быць жывым і бачыць сонца*, „ARCHE-пачатак" 2005, № 4, с. 65–70; П. Абрамовіч, *Глыток вады з крыніцы,* „ARCHE-пачатак" 2006, № 6, с. 461–463.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



*гінальная беларушчына*, *Новая маргінальная беларушчына*[26], асобнымі публікацыямі праекту *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча* А. Бахарэвіча[27]).

[26] Л. Корань, *Новая маргінальная беларушчына. Паводле цытат*, [у:] Л. Корань, *Цукровы пеўнік: Літаратурна-крытычныя артыкулы,* Мінск 1996, с. 275–280; Л. Сінькова, *Старая маргінальная беларушчына*, „Літаратура і мастацтва" 2009, 21 жніўня, с. 7; Л. Сінькова, *Старая маргінальная беларушчына ў тэкстах А. Бахарэвіча, М. Мартысевіч і Е. Вежнавец*, „Беларускае літаратуразнаўства", вып. 7, Мінск 2009, с. 68–75; А. Бязлепкіна, *Па Гамбурскім рахунку,* „Літаратура і мастацтва" 2009, 11 верасня, с. 6; Л. Алейнік, *Што рабіць з чалавекам, які абразіў* […], „Літаратура і мастацтва" 2009, 25 верасня, с. 4: „Прафесар Сінькова толькі дала кампетэнтную ацэнку творчасці маладзёнаў, якія лічаць, што аплёўваць нацыянальнае – гэта цалкам натуральна. Так, ацэнку рэзка негатыўную. А вы чакалі якой?"; Н. Пазняк, *Дыстанцыя паміж пакаленнямі,* „Літаратура і мастацтва" 2009, 25 верасня, с. 4: „[…] дыстанцыя паміж пісьменніцкім пакаленнем „дзевяностых" і іх папярэднікамі вынікае са стаўлення да літаратурнай традыцыі: сакральнасць, якую нельга не тое што парушаць, а нават ставіць пад сумнеў, – гэта для другіх; спроба аб'ектыўна вызначыць, што ёсць такое нацыянальны міф і беларуская рэчаіснасць сёння – для першых"; А. Бязлепкіна, *Уяўленне традыцыі,* „Літаратура і мастацтва" 2009, 23 кастрычніка, с. 7; Т. Нядбай, *Літаратура – хірургі VS нацыятворцы,* Сайт грамадскай культурніцкай кампаніі „Будзьма беларусамі!" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://budzma.org/projects/pohliad/khirurhi-vs-nacyyatvorcy.html, дата доступу: 02.10.2009: „[…] і адзін бок дыскусіі, і другі няслушна расстаўляюць акцэнты, а сама дыскусія – выдатнае сведчанне таго, што ні адзін, ні другі бок не чуюць сваіх апанентаў. То бок фактычна і дыскусіі няма, бо ёсць два маналогі, а не дыялог".

[27] А. Бахарэвіч, *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча*, Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/archive/hamburg_rating/latest/15621/15621.html, дата доступу: 31.08.2012; М. Скобла, *Рыгор Сітніца: „Нацыянальнае хунвэйбінства трэба спыняць"*, Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/transcript/24409938.html, дата доступу: 02.12.2011: „[…] ён [А. Бахарэвіч] абсалютна бэзапэляцыйна і бязьлітасна распраўляецца з нашай нацыянальнай літаратурай"; С. Абламейка, *Барыс Пятровіч: Люблю чытаць Бахарэвіча,* Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/article/24419894.html, дата доступу: 12.12.2011: „Рэакцыя Рыгора Сітніцы – гэта рэакцыя чытача, ня сябра Саюзу, дарэчы, а проста чытача на мастацкі тэкст. І я расцэньваю гэта як дыскусію з нагоды выхаду мастацкага твора. Кожны аўтар павінен, мне здаецца, радавацца, што твор ягоны не прайшоў незаўважаным, а выклікаў палеміку, увагу […] скажу шчыра, даўно ў нас не было, каб мастацкі твор выклікаў такую жывую дыскусію"; Я. Максімюк, *Цёмная камора белліту,* Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/article/24416730.html, дата доступу: 09.12.2011: „Дыскусію на сайце Свабоды вакол эсэ Альгерда Бахарэвіча *Цёмнае мінулае Каяна Лупакі* і абразьлівага выказваньня Рыгора Сітніцы ў адрас Альгерда Бахарэвіча ў «Вольнай Студыі» Міхася Скоблы я чытаў зь вялікім зацікаўленьнем. Ня памятаю ўжо, калі апошні раз публічная дыскусія пра беларускую літаратуру падышла амаль усутыч да яе цёмнай каморы, зьмесьціва якой да гэтай пары ніхто так і ня браўся дакладна разглядаць і апісваць"; М. Скобла, *Купала Янка і лаянка*, Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/article/24420535.html, дата доступу: 13.12.2011: „[…] ці ж варта твор Купалы, хай сабе і няўдалы, называць гідотай? Увогуле мяне зьдзіўляе, зь якой лёгкасьцю і безапэляцыйнасьцю Ян Максімюк выносіць свае прысуды"; С. Дубавец, *Залатая мумія,* Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/article/24421887.html, дата доступу: 14.12.2011: „Бахарэвіч стварыў моцны і тра-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



Для таго, каб правакацыя стала паспяховай (выклікала плённую дыскусію), неабходны пэўныя ўмовы:

1. Рэлевантнасць тэмы для літаратурнай супольнасці / Сутыкненне інтарэсаў (размеркаванне сімвалічнай улады).

2. Даступнасць тэкстаў (даступны і папулярны СМІ, заўважная назва і г.д.).

3. Дасягальнасць заяўленай „ідэальнай" мэты (змяненне сітуацыі ў літаратурным працэсе).

Так, дыскусія пра спецыфіку беларускага постмадэрнізму ў часопісе „ARCHE-пачатак"[28] за выключэннем асобных публікацый не пакінула межаў часопіса – на наш погляд, з-за невыканання адразу некалькіх умоў: даступнасці тэкстаў (напаўлегальны статус і спецыфічная грамадска-палітычная арыентацыя СМІ, у якім адбывалася дыскусія, не дазволіў уключыцца ў яе літаратуразнаўцам, чые даследчыцкія інтарэсы блізкія ўзнятай тэме[29]), рэлевантнасці

гічны вобраз Каяна Лупакі. Прасьцей кажучы, сказаў пра Купалу нешта новае і па-свойму. Больш у дыскусіі ніхто нічога новага ці па-свойму не сказаў. Калі пра Купалу не казаць чагосьці новага і па-свойму, Купала памірае, а мёртвы Купала нікому нецікавы […] А галоўнае пытаньне – ці гэта спрэчка за манаполію на Купалу? Адказ – так".

28 Д. Жукоўскі, *Псткі на хайвэі постмадэрнізму*, „ARCHE-Скарына" [Электронны рэсурс], 2001. №4. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/2001–4/zukov401.html, дата доступу: 30.10.2006; Д. Жукоўскі, *Чырвоныя зь зялёным і чырвоныя зь белым. Агляд літаратурных часопісаў 2001 году*, „ARCHE-пачатак" [Электронны рэсурс], 2001. № 6. Рэжым доступу: ARCHE.bymedia.net/2001–6/zuko601.zip, дата доступу: 26.10.2006; А. Бацюкоў, *Штурханьне ўбок*, „ARCHE-пачатак" 2003, №1, с. 87–92; С. Балахонаў, *Архіпэляг постмадэрн, або Аналізу халодная сьляза*, „ARCHE-пачатак" [Электронны рэсурс], 2003, № 3. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/2003–3/bala303.html, дата доступу: 30.10.2006; Д. Жукоўскі, *У лабірынце з постмадэрністам*, „ARCHE-пачатак" [Электронны рэсурс], 2004, № 1. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/2004–1/zhukouski104.htm, дата доступу: 30.10.2006; Ю. Пацюпа, *Постмадэрнізм, калыска мая*, „ARCHE-пачатак" [Электронны рэсурс], 2004, № 3. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/2004–03/paciupa403.htm, дата доступу: 30.10.2006; С. Балахонаў, *Entlarvung адзінокага ў пустэльні*, „ARCHE-пачатак" 2004, № 4, с. 286–289.

29 Постмадэрнізм у беларускай літаратуры з'яўляецца аб'ектам навуковай цікаўнасці Г. Кісліцынай (Г. Кісліцына, *Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы*, Мінск 2006, Г. Кісліцына, *Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай літаратуры*, Мінск 2010), М. Тычыны (М. Тычына, *Феномен пераходнага перыяду: праблемы тыпалогіі* [у:] *Літаратура пераходнага перыяду: тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу*, навук. рэд. М. А. Тычына, Мінск 2007, с. 6–100), культурасофскіх рэфлексій В. Акудовіча (Акудовіч В., *Уводзіны ў новую літаратурную сітуацыю. Лекцыі для Беларускага Калегіюма*, „Фрагмэнты" [Электронны рэсурс], 1999, № 7–9. Рэжым доступу: http://bk.baj.by/lekcyji/litaratura/akudovicz01.htm, дата доступу: 23.12.2006), а таксама спрычыняецца да публічных выказванняў шматлікіх літаратуразнаўцаў – напрыклад, В. Максімовіч адзначае „перанасычанасць кніжнага рынку таннай прадукцыяй постмадэрнісцкага «пакрою», якая […] спрыяе ператварэнню самой сябе ў крыніцу разбэшчвання душ праз навязванне паталогіі і дэградацыі" [В. Максімовіч, *Новая літаратурная сітуацыя: змены і антызмены*, [у:] *Сучасны літаратурны працэс: пісьменнік і жыццё*, „Полымя" 2006, № 10, с. 173–179], У. Гніламёдаў залічае сябе да постмадэрністаў [У. Гніламёдаў, *„Я заўсёды іду ад факта…"*, „Полымя" 2007,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



тэмы (абмеркаванне было ўспрынята як асабісты канфлікт паміж крытыкамі). Недасягальнасць мэты робіць бясплёнными шматлікія дыскусіі ў спецыялізаваных СМІ – напрыклад, пра дзіцячую літаратуру[30]. Папулярнасць СМІ таксама адыгрывае значную ролю: так, артыкул Л. Сіньковай *Старая маргінальная беларушчына ў тэкстах А. Бахарэвіча, М. Мартысевіч і Е. Вежнавец*, апублікаваны ў навуковым выданні, выклікаў дыскусію толькі пасля передруку (са скарачэннямі) у штотыднёвіку „Літаратура і мастацтва" і змяшчэнні ў электронным выглядзе ў папулярным блогу; артыкул М. Аляшкевіч *10 things to hate about you, my literature*, апублікаваны ў культурніцкім часопісе „pARTizan", атрымаў розгалас пасля передруку ў больш папулярным электронным часопісе перакладной літаратуры „ПрайдзіСвет" і яго прамоцыі ў сацыяльных сетках.[31] У якасці прыкладу выканання большасці ўмоў прывядзём *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча* – цыкл эсэ-інтэрпрэтацый беларускай савецкай літаратуры: тэма ацэнкі савецкай спадчыны застаецца рэлевантнай у беларускай постсавецкай літаратуры; аўтар закранае інтарэсы прадстаўнікоў акадэмічнага літаратуразнаўства (многія з якіх прысвяцілі жыццё вывучэнню і інтэрпрэтацыі твораў беларускай савецкай літаратуры); пастаянная даступнасць тэкстаў у інтэрнэце спрыяе ўдзелу ў дыскусіі шырокіх колаў літаратурнай супольнасці (у той жа час, грамадска-палітычная арыентацыя рэсурса таксама не дазваляе частцы зацікаўленых крытыкаў і літаратуразнаўцаў зрабіць свой унёсак у дыскусію).

Эмацыйная кампанента дапамагае стварыць канфлікт пазіцый нават пры адсутнасці аргументацыі па ўзнятай праблеме, чым, магчыма, абумоўлена яркая эмацыйнасць правакацый удзельнікаў літаратурна-крытычнай камунікацыі ў інтэрнэце.

Пашыранасць стратэгіі рызыкі сярод маладых крытыкаў альбо крытыкаў-непрафесіяналаў разам са скарачэннем колькасці прафесійных крытыкаў спрыяе фарміраванню негатыўнага вобраза крытыка, павялічвае рэпутацыйны разрыў паміж крытыкай і літаратуразнаўствам.[32] Адначасова правакацыйная стратэгія

№12, с. 133–148], В. Локун даследуе ўплыў постмадэрнізму на беларускую прозу [Локун В., *Белорусская проза XXI века и постмодернизм*, „Нёман" 2009, № 3, с. 138–149] і г.д.

[30] А. Каўко, *Ці ўратуе нас Вiнi-Пух?*, „Літаратура і мастацтва" 2001, 5 студзеня, с.7; І. Шаўлякова, *Сталыя клопаты дзіцячай літаратуры*, „Літаратура і мастацтва" 2006, 24 лістапада, С.6; М. Южык, *Што чытаць дзецям,* „Полымя" 2007, № 11, с. 128–131; В. Барысенка, *Якія кніжкі ў дзяцінстве чытаць?,* „Полымя" 2008, № 8, с. 98–101; Ф. Драбеня, *Сучасная беларуская дзіцячая драматургія: сюжэты, матывы, вобразы*, „Полымя" 2008, № 11, с. 107–136; Л. Алейнік, А. Грыбоўскі, *Беларуская дзіцячая паэзія: учора і сёння*, „Полымя" 2009, № 2, с. 128–136, М. Аляшкевіч, *Якой павінна быць дзіцячая кніга?*, „Літаратура і мастацтва" 2011, 6 студзеня, с. 2, і інш.

[31] М. Аляшкевіч, *Дзевяць прычынаў не любіць беларускую літаратуру*, „Прайдзісвет" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://prajdzisvet.org/critique/31-dzieviats-prychynau-nie-liubits-bielaruskuju-litaraturu.html, дата доступу: 15.11.2011.

[32] І. Шаўлякова апісвае сітуацыю ў беларускай літаратурнай крытыцы першай дэкады XXI ст. як рэпутацыйны крызіс: І. Шаўлякова, *„Рэпутацыя" пасля (аўта)дыскваліфікацыі.*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



прыносіць карысць літаратурнаму працэсу: 1) разнастаіць літаратурнае жыццё за кошт дыскусій; 2) хутка ўводзіць у літаратурны працэс новых удзельнікаў; 3) дазваляе актывізаваць („справакаваць") іншых крытыкаў, мабілізаваць іх на асвятленне пэўнай літаратурнай праблемы – так, напрыклад, заяўленне М. Южыка, што ў беларускай літаратуры не было дысідэнтаў і неапублікаваных у савецкі час твораў, мела наступствам публікацыю А. Марціновіча з доказамі іх наяўнасці ў беларускай літаратуры.[33] Пакуль крытыкі „правакуюцца", чытачы выйграюць.

**Стратэгіі грунтоўных рашэнняў**

Большасць прафесійных крытыкаў выпрацоўвае шматкрокавыя і доўгатэрміновыя стратэгіі, якія ўмоўна пазначым як групу „стратэгій грунтоўных рашэнняў", у якой сімвалічны капітал дасягаецца не так хутка, як у стратэгіі рызыкі, але захоўваецца больш працяглы перыяд часу і можа падлягаць канвертацыі.

Колькасць і паслядоўнасць крокаў у гэтых стратэгіях залежыць ад мэтаў аўтара. З практыкі найбольш актыўных крытыкаў 2000-х гг. намі вылучаны наступныя крокі:

1) сегментацыя аўдыторыі (вылучэнне пэўнага чытацкага сегмента);

2) пазіцыянаванне ў літаратурным працэсе праз пэўны СМІ (сталая праца ў літаратурным выданні), канцэпцыю;

3) назапашванне сімвалічнага капіталу („напрацоўка" імя, рэпутацыі, аўтарытэта крытыка);

4) канвертацыя сімвалічнага капіталу ў матэрыяльны (выданне кнігі крытыкі, атрыманне прэміі);

5) канвертацыя матэрыяльнага капіталу ў сімвалічны (выдадзеныя кнігі, атрыманыя прэміі павышаюць статус крытыка);

6) уплыў на падрыхтоўку кадравай змены (удзел у журы конкурсаў, фарміраванне „школы").

Аўтарам гэтай групы ўласціва пэўная „брэндызацыя", пад якой маем на ўвазе выкарыстанне медыйнага вобразу (імя) аўтара як гарантыі (знака) якасці літаратурна-крытычнай прадукцыі.

Стратэгіі грунтоўных рашэнняў прадугледжваюць адзінства стылю (у т.л. лексіка-граматычныя і кампазіцыйныя асаблівасці тэкстаў), паслядоўнасць крытычных выступаў (вернасць абранай стратэгіі) і пастаянства (час знаходжання ў літаратурнай прасторы, памножаны на частату крытычных выступаў).

Вылучым у межах гэтай групы наступныя стратэгіі: „белетрызаванае літаратуразнаўства"; „асветніцкая крытыка"; „сублімацыйная крытыка".

Асобна варта згадаць **персанажнасць** у літаратурнай крытыцы – канструяванне медыйнага вобразу аўтара, якое вядзе да стварэння фіктыўнай асобы,

*Беларуская літаратурная крытыка 2000-х*, „Дзеяслоў" 2012, № 5, с. 326–330.

[33] М. Южик, *Пространство белорусского слова*, „Нёман" 2005, № 10, с. 168–176; А. Мартинович, *Сжигая мосты – построй собственную переправу*, „Нёман" 2005, № 10, с. 177–181.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



персанажа або маскі, якую аўтар крытычнага тэксту выкарыстоўвае для большай вольнасці выказвання, правакавання рэакцыі на крытычны тэкст альбо ўласнага задавальнення. Удалай спробай падобнага канструявання з'яўляецца медыявобраз Г. Кісліцынай. Кнігу крытыкі гэтага аўтара *Blonde attack* (2003) аздабляе выява аўтара ў касцюме ружовага зайчыка; калонка аўтара на сайце „Новая Эўропа" выходзіць пад назвай *Blonde attack*[34]; калонка Г. Кісліцынай у рэспубліканскай газеце „Звязда" мае назву *Дзённік бландзінкі*[35], у інтэрв'ю „Еўрарадыё" крытык называе сябе „светапоглядная бландынкай".[36] Шэраг стэрэатыпных асацыяцый вобразу бландзінкі (пяшчота, безабароннасць, гуллівасць, легкадумнасць) уваходзіць у дысананс са статусам літаратуразнаўцы, кандыдата навук, старшага навуковага супрацоўніка акадэмічнага інстытута, што дазваляе крытыку інтрыгаваць і правакаваць чытача. Выяўленні сканструяванасці вобраза крытыка адзінкавыя (С. Шыдлоўскі[37]), агульным месцам успрыняцця робіцца зліццё асобы аўтара з медыявобразам[38], што ў выніку зніжае пазітыўны эфект персанажных крытычных выступленняў. У той жа час, патэнцыял персанажнасці як прыёму ў беларускай літаратурнай крытыцы далёка не вычарпаны.

[34] Г. Кісліцына, *Blonde attack* (Калонка культурнага аглядальніка), Новая Эўропа [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://n-europe.eu/columns/author/ganna_kislitsyna, дата доступу: 14.03.2012

[35] Г. Кісліцына, *Дзённік бландзінкі*, „Звязда" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.zvyazda.minsk.by/second.html?r=24&p=33, дата доступу: 26.05.2010.

[36] А. Балаховіч, *Бландынка – гэта светапогляд?* Еўрарадыё [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://euroradio.fm/report/blandynka-geta-svetapoglyad–109071, дата доступу: 2.06.2012: „[…] я свядомая бландынка, я светапоглядная бландынка. У пэўны момант я зразумела, што мне – кандыдату навук, літаратуразнаўцы – не хапае лёгкасці, не хапае лёгкасці перш за ўсё ў адносінах з людзьмі".

[37] С. Шыдлоўскі, *Рэйд у ружовым маскхалаце,* „ARCHE-пачатак", [Электронны рэсурс] 2003, № 3. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/2003–3/szyd303.html, 12.08.2006: „Прафэсіяналы пяра апранаюць запатрабаваны камэрцыйным попытам камуфляж і выходзяць у поле. Ружовыя вушкі трусіка на вокладцы зборніка крытычных эсэ Ганны Кісьліцынай „Blonde attack" могуць падмануць толькі беларускага літаратара, што пэрманэнтна выпадае з кантэксту эпохі. Для назіральнага ж сучасніка зразумела адразу — гэта маскхалат. Такіх вачэй не схаваеш".

[38] Каментарыі да артыкула: Г. Кісліцына, *Як я здымалася для календара*, „Звязда" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/ru/issue/article.php?id=69282, дата доступу: 13.11.2010: „[…] как назовешь корабль (Дзённік бландзінкі), так он и поплывет"; „Одно из двух, или она порвет себе мозг и напишет что-нибудь совсем гениальное, или её до конца жизни будут обходить за три версты женщины, мужчины, поэты, фотографы, представители агентств, знакомые представителей агентств, короче – любой потенциальный враг БЛОНДИНКИ". Спецыфічная ацэнка медыявобраза крытыка ў артыкуле: Ю. Пацюпа, *Пра кавалерысцкі наезд на пісьменьніцкія хутары*, „ARCHE-пачатак" [Электронны рэсурс], 2006, № 11. Рэжым доступу: http://ARCHE.bymedia.net/2006–11/paciupa611.htm, дата доступу: 05.02.2007.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



## „Белетрызаванае літаратуразнаўства"

Крытычная стратэгія „белетрызаванае літаратуразнаўства" аб'ядноўвае навуковы аналіз літаратурных твораў са стварэннем займальнага крытычнага тэксту, у якім ужываюцца разнастайныя спосабы падтрымання чытацкай увагі. У адрозненне ад таленавітага літаратуразнаўчага тэксту (напрыклад, ад надзвычай захапляльнага даследавання Г. Кісялёва *Жылі-былі класікі*[39]), крытычнае „белетрызаванае літаратуразнаўства" зазвычай застаецца ў традыцыйным для беларускай крытыкі тэматычным полі, робячы прадметам сваёй цікавасці новыя творы беларускай літаратуры і праблемы бягучага літаратурнага працэсу. Найчасцей крытыкі, якія ўжываюць азначаную стратэгію, адначасова з'яўляюцца літаратуразнаўцамі і выкладчыкамі: першае абумоўлівае грунтоўнасць аналізу, другое – пошук даходлівай формы выкладу. Крытык, літаратуразнавец, выкладчык і пісьменнік П. Васючэнка „белетрызуе" даследаванне стану беларускай літаратуры мяжы стагоддзяў аўтарскімі жанрамі – мініяцюрамі (філалагемамі і пятрогліфамі)[40], надзвычай запатрабаванымі ў інфармацыйна перагружанай медыякультурнай прасторы, захапляльнымі, па-журналісцку майстэрскімі загалоўкамі (*Антыглабаліст Карлсан*, *Беллiт як казус*, *Суіцыд на глебе літаратуры*, *Купала – дадаіст* і г.д.) і яскравым мастацкім стылем. Заўважым, што і напаўненне гэтых жанраў спрыяе ўтрыманню чытацкай цікаўнасці: выяўленне сутнасці літаратурных працэсаў адбываецца ў вобразнай форме (напрыклад, існаванне беларускага савецкага літаратара апісана як жыццё ў баракамеры), нечаканых параўнаннях (так, нонканфармізм выяўляецца ў школьнага настаўніка батанікі і ў драме Г. Ібсена), падпарадкавана аўтарскай канцэпцыі, якую можна акрэсліць як філалагічны беларусацэнтрычны апымізм (беларуская літаратура багатая і разнастайная, яе росквіт адбудзецца неўзабаве і далучыцца да шырокай беларусізацыі грамадства). Кніга *Ад тэксту да хранатопа*[41] больш стрыманая як у аптымізме, так і ў стылі, аднак захоўвае ранейшыя спосабы белетрызацыі і з'яўляецца, на нашу думку, часткай менавіта крытычнага, а не літаратуразнаўчага дыскурсу. Хаця асноўную частку кнігі складаюць эсэ пра класікаў беларускай літаратуры (што традыцыйна лічыцца прадметам літаратуразнаўчага вывучэння), літаратуразнаўчая дасведчанасць тут спрыяе актуалізацыі („продажу") класікаў і іх твораў для сучаснага чытача, робіцца своеасаблівай правакацыяй удзельнікам літаратурнага працэсу[42]. У прыведзеных тэкстах П. Васючэнкі,

[39] Г. Кісялёў, *Жылі-былі класікі: хто напісаў паэмы „Энеіда навыварат" і „Тарас на Парнасе"*, Мінск 2005.

[40] П. Васючэнка, *Адлюстраванні першатвора: Літаратура ў філалагемах і пятрогліфах*, Мінск 2004.

[41] П. Васючэнка, *Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы*, Мінск 2009.

[42] Г. Кісліцына, *Тэкст і хранатопы Пятра Васючэнкі,* Сайт грамадскай культурніцкай кампаніі „Будзьма беларусамі!" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://budzma.org/news/tekst-i-khranatopy-pyatra-vasyuchenki.html, дата доступу: 31.03.2009.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



а таксама іншых прыхільнікаў стратэгіі „белетрызаванае літаратуразнаўства", крытыка выступае ў адной з сваіх амаль страчаных у 2000-я гг. функцый – функцыі культурнай рэфлексіі на грунце літаратурнних тэкстаў. Менавіта гэта функцыя, лічым, адрознівае крытыку і анатаванне, пашырэнне якога назіралася напрацягу першай дэкады XXI ст.

Крытык, літаратуразнавец, выкладчык і пісьменнік І. Штэйнер выкарыстоўвае ў крытыцы, якая абапіраецца на літаратуразнаўчы аналіз твораў, парадаксальныя фармулёўкі, нечаканыя лагічныя звязкі і класіфікацыі літаратараў[43] (так, у эсэ *Я покажу тебе страх в горстке праха*[44] лагічнай звязкай з'яўляецца творчасць С. Кінга, а аналізуюцца творы В. Быкава, Я. Баршчэўскага, Ю. Станкевіча, А. Глобуса, Ф. Сіўко; Якуб Колас, Алесь Гарун і С. Дубавец роўныя ў матэрыялізацыі страху ў воўчым абліччы, і г.д.); у рускамоўных тэкстах як стылістычны прыём задзейнічаны беларускамоўныя выразы і прэцэдэнты, некаторыя артыкулы ўдаюць гутарковы стыль, у якім, аднак, з'яўляюцца лацінскія прымаўкі; усё разам змяншае манатоннасць чытання і актывізуе ўвагу чытача, у той час як выдатная эрудыцыя аўтара, літаратуразнаўчая сістэмнасць веды ўтвараюць трывалы грунт для крытычнага „вольнага палёту думкі" (М. Тычына), які ў іншым выпадку мог бы падацца павярхоўным.

Найбольш поўнае і паслядоўнае ажыццяўленне стратэгіі выяўлена намі ў крытычнай дзейнасці І. Шаўляковай. Прыкметы „навуковасці" і „белетрызацыі" ў тэкстах гэтага аўтара знітаваны, утвараючы запамінальны стыль. Лагічная выбудаванасць артыкулаў, з аднаго боку, з'яўляецца вынікам навуковага аналізу з'яў мастацтва (уводзіны/акрэсленне праблемы, прывядзенне аргументаў, улік контраргументаў, высновы), а з іншага, задае выразную структуру, якая аблягчае чытанне. Іронія, самаіронія і гумар павышаюць чытэльнасць складаных сінтаксічных канструкцый; арыгінальныя загалоўкі, шматмоўе, інтэртэкст, прэцэдэнты, гульня слоў, жанравы наватарствы (напрыклад, паралельны агляд у кнізе *Рэстаўрацыя шчырасці*[45], *крытычныя маланогі з пралогам і эпілогам* у *Сентыментальным паляванні*[46], бенефісы ў *Сапраўдных хроніках Поўні*[47]), графіч-

[43] Як адзначае М. Тычына, „І. Ф. Штэйнер віртуозна авалодаў прыёмам, заснаваным на асацыятыўнай сувязі з'яў сучаснай літаратуры са з'явамі сусветнай літаратуры. Уражвае свабода і нязмушанасць аўтара кнігі ў адносінах да імёнаў, да паняцця іерархіі, — па сутнасці, яго артыкулы ўяўляюць сабой вольны палёт думкі, якая на нашых вачах то лунае да нябёсаў, то вяртаецца да зямных спраў і клопатаў". – М. Тычына, *У засені тысячагоддзя,* [у:] І. Штэйнер, *Ex Promtu – Ex Proposito*, Гомель 2008, с. 3–6.

[44] І. Штэйнер, *Я покажу тебе страх в горстке праха,* [у:] І. Штэйнер, *Deja vu, або Успамін пра будучыню*, Мінск 2003, с. 32–54.

[45] І. Шаўлякова, *Кунсткамера: „Дзень сурка"*, [у:] І. Шаўлякова, *Рэстаўрацыя шчырасці: літаратурна-крытычны канструктар*, Мінск 2005, с. 110–127.

[46] І. Шаўлякова, *Сентыментальнае паляванне, або У крытычных сутарэннях: Артыкулы, рэцэнзіі*, Мінск 2000, с. 70–77.

[47] І. Шаўлякова, *Героі (без партрэтаў),* [у:] І. Шаўлякова, *Сапраўдныя хронікі Поўні: артыкулы і рэцэнзіі,* Мінск 2011, с. 21–82.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



ныя вылучэнні разнастаяць пісьмо, выступаючы для чытача своеасаблівай кампенсацыяй за навуковы катэгарыяльна-паняційны апарат, сістэмнасць аглядаў, выбудову шырокага іерархічнага кантэксту, і г.д.[48] (вобразна тэкст І. Шаўляковай можна ўявіць як баявы танк пад пярэстай коўдрай у стылі пэч-ворк). Выразнай часткай стратэгіі з'яўляецца ацэнка, аналіз і карэкцыя вобразу крытыкі як творчасці і прафесійнай дзейнасці, фарміраванне іміджу крытыкаў як „літаратурнай інтэлігенцыі".

Універсальнасць таленту беларускіх крытыкаў, якія традыцыйна сумяшчаюць глыбокую абазнанасць у заканамернасцях літаратурнага працэсу, журналісцкае (публіцыстычнае) і пісьменніцкае майстэрства, сумесна з рэпутацыйным крызісам крытыкі (з-за якога выступ з пазіцыі літаратуразнаўцы падаецца больш аўтарытэтным), на наш погляд, робяць „белетрызванае літаратуразнаўства" стратэгіяй выбару беларускай прафесійнай крытыкі ў перыяд да завяршэння трансфармацыйных працэсаў і выбудовы новай крытычнай Традыцыі.

## „Асветніцкая крытыка"

Стратэгія прадугледжвае прывіццё навыкаў чытання беларускай літаратуры шырокаму колу чытачоў. У адрозненне ад аўтараў „белетрызаванага літаратуразнаўства", якія звяртаюцца пераважна да прафесійнага чытача (літаратара, філолага, гуманітарыя) – рэальнага чытача сучаснай беларускай літаратуры, прыхільнікі „асветніцкай крытыкі" працуюць з іншым сегментам аўдыторыі – чытачом патэнцыйным. Таму натуральна, што такая крытыка імкнецца да кіравання патрэбамі чытача, выконвае рэкрэацыйную (забаўляльную), эстэтычную (развіццё густу), выхаваўчую (духоўны рост) функцыі. Падобна да папярэдняй стратэгіі, „асветніцкая крытыка" выкарыстоўвае прывабную абалонку для трансляцыі карысных чытачу (на думку крытыка) інфармацыі, поглядаў, перакананняў. У адрозненне ад „белетрызаванага літаратуразнаўства", такая крытыка імкнецца пазбегнуць вонкавых прыкмет навуковасці. Найбольш паслядоўным прыхільнікам стратэгіі з'яўляецца пісьменніца, літаратурны крытык, культурны аглядальнік Л. Рублеўская, крытычным рубрыкам якой у газеце „СБ – Беларусь сегодня"[49] ўласцівы яснасць тэрміналогіі (тлумачэнні „на пальцах"), вызначанасць крытэрыяў і манахромнасць ацэнак (альбо „дагматычная крытыка", па вы-

48 Падрабязней аналіз стылю крытыкі І. Шаўляковай прадстаўлены ў артыкуле: М. Аляшкевіч, *Інтэлігентнасць= вышэйшая зброя, альбо Як гатаваць рызота з каракацыцы*, „Літаратура і мастацтва", 4 ліст. 2011, с. 6.

49 Л. Рублевская, *Книжный навигатор*, „СБ – Беларусь сегодня" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.sb.by/post/38126, дата доступу: 19.08.2010; Л. Рублевская, *Литературные погоды*, „СБ – Беларусь сегодня" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.sb.by/post/108943, дата доступу: 30.11.2010; Л. Рублевская, *Триолет*, „СБ – Беларусь сегодня" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.sb.by/post/92353, дата доступу: 14.10.2009;

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



значэнні Н. Агафонавай[50]), празрыстасць (нейтральнасць) стылю, лаканічнасць (інфармацыйная ёмістасць), гіпертэкставасць (азнаямляльныя адсылкі да знешніх крыніц інфармацыі, найчасцей гістарычнага характару), спецыфічная вобразнасць (перавага аддаецца побытавым, маскультавым, эмацыйна-афарбаваным вобразам), элемент гульні (у тым ліку словамі, прэцэдэнтамі), „усёеднасць" (шырыня ахопу літаратурнага працэсу, літаратурных кантэкстаў).

Калі Л. Рублеўская ажыццяўляе пазіцыянаванне (сябе як крытыка і беларускай літаратуры як прывабнага прадукта) ў адным СМІ, то А. Марціновіч, чыя літаратурна-крытычная дзейнасць блізкая да апісанай стратэгіі, выступае ва ўсіх дзяржаўных літаратурна-мастацкіх СМІ, відавочна робячы стаўку на шырыню ахопу. Больш як 30-цігадовая творчасць гэтага „ўсюды-існага" крытыка не выходзіць за межы прынагоднага рэцэнзавання і водгуку (у тым ліку ў жанры літаратурна-біяграфічнага нарыса, юбілейнага артыкула), што, аднак, не разбурае стэрэатып, адпаведна якому бягучай беларускай літаратурнай крытыкі не існуе.

Адмысловыя варыянты стратэгіі на працягу 2000-х гг. ажыццяўлялі крытыкі Д. Жукоўскі, у тэкстах якоганазіраўся прыярытэт чытача і чытання (найбольш яскравы прыклад – артыкул *Крытэр дызеля*[51], дзе літаратуру прапаноўваецца ацэньваць па здольнасці альбо нездольнасці захапіць увагу пасажыраў электрычкі), П. Абрамовіч, які сцвярджаў аксіялагічную роўнасць усіх напісаных тэкстаў, прысвячаў шмат увагі творам масавай літаратуры і культуры[52] і, змяшчаючы ў такі кантэкст беларускую літаратуру, набліжаў яе да масавага (у тым ліку рускамоўнага) чытача. Патэнцыял крытыкі П. Абрамовіча палягае таксама ў яе спецыфічнай (лаканічнай, фрагментарнай, эсэістычнай) форме, якая выявілася аднолькава прыдатнай для друкаванага выдання і інтэрнэт-блогу.

Л. Рублевская, *Три вопроса критику*, „СБ – Беларусь сегодня" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.sb.by/post/138600, дата доступу: 30.10.2012.

[50] Н. Агафонова, *Искусствоведение и художественная критика: к проблеме разграничения полномочий*, [у:] *СМИ и современная культура*: сб. науч. тр., ред. Л. П. Саенковойа, Минск 2012, с. 26–32.

[51] Д. Жукоўскі, *Крытэр дызеля,* „ARCHE-пачатак" 2006, № 1–2, с. 57–61.

[52] Напрыклад, частыя публікацыі пра С. Кінга (П. Абрамовіч, *Стивен Кинг и белорусский „смеющийся тигр"*, [у:] П. Абрамовіч, *Чытаць каб жыць*, Блог [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://paval-abramovi4.livejournal.com/140604.html, дата доступу: 18.11.2012; П. Абрамовіч, *Ужас по имени Время,* [у:] П. Абрамовіч, *Чытаць каб жыць*, Блог [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://paval-abramovi4.livejournal.com/136961.html, дата доступу: 28.10.2012); часта ўвага крытыка надаецца сучасным прыладам, якія актывізуюць чытача (П. Абрамовіч, *„В реке какая-то ху*ня. Грека": смс-ки героев книг,* [у:] П. Абрамовіч, *Чытаць каб жыць*, Блог [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://paval-abramovi4.livejournal.com/138834.html, дата доступу: 06.11.2012; пра электронныя кнігі – П. Абрамович, *Это литературная революция! Так кто же обогатился?* Bel.Biz – Беларускі бізнэс [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://style.bel.biz/articles/eto_literaturnaya_revolyuciya_tak_kto_zhe_obogatilsya, дата доступу: 02.11.12).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



Канцэпцыя „асветніцкай крытыкі" – несці беларускую літаратуру „ў свет шырокі", вызваляючы яе з гета элітарнасці, фарміраваць прэстыжнасць чытання як інтэлектуальнай дзейнасці – падаецца надзвычай запатрабаванай ва ўмовах скарачэння прасторы беларускага слова і маргіналізацыі літаратуры. Аднак у сувязі з неабходнымі для масавага чытача спрашчэннямі і непазбежнай вульгарызацыяй адлюстравання літаратурнага працэсу прыхільнікам гэтай крытычнай стратэгіі даводзіцца сутыкацца з негатыўным стаўленнем літаратурнага асяроддзя, у тым ліку з адмаўленнем прыналежнасці іх тэкстаў да крытычнага дыскурсу.

## „Сублімацыйная крытыка"

Стратэгію ажыццяўляюць пісьменнікі, якія рэалізуюць творчую энергію ў жанры літаратурнай крытыкі. Стратэгія ўключае такія сродкі, як павышаная вобразнасць, падкрэсленая асобаснасць (эксплікацыя ў крытычным тэксце асабістага досведу чытання, пісьма, знаёмства з пісьменнікам і абставінамі яго жыцця і пад. – падрабязней пра „асобасную цэнтрыраванасць крытычнай рэфлексіі" гл.: [53]), стварэнне сітуацыі дыялогу (з чытачом, у тым ліку пісьменнікам), некаторая разняволенасць (фамільярнасць) выказванняў у дачыненні да калег па пяры. Падставай для вылучэння стратэгіі з'яўляецца актыўная і паслядоўная крытычная дзейнасць пісьменнікаў, у тым ліку на фоне іх публічнага адмаўлення жанраў, што прынеслі ім літаратурны поспех (Л. Галубовіч[54], Ю. Сапажкоў[55]). Традыцыя пісьменніцкай крытыкі Беларусі багатая, аднак у 2000-х гг., па назіраннях І. Шаўляковай, нягледзячы на выхад асобных крытычных кніг пісьменнікаў, прастора пісьменніцкай крытыкі „няўмольна звужалася".[56] У той жа час, у спарадчыных крытычных выступах С. Балахонава, А. Хадановіча, З. Вішнёва бачны вялікі патэнцыял, а крытычная дзейнасць, Ю. Сапажкова, Л. Галубовіча сталася прыкметнай з'явай у літаратурнай прасторы 2000-х гг. Так, крытыка Ю. Сапажкова з'яўляецца рэдкім выпадкам пазітыўнай ацэнкі і паслядоўнага асвятлення рускамоўным крытыкам беларускага (беларускамоўнага) літаратурнага працэ-

53 І. Шаўлякова, *ЧАЛАВЕК + ПІСЬМЕННІК = (ВОЛЬНЫ) ЭСЭІСТ*, [у:] *Сапраўдныя хронікі Поўні: артыкулы і рэцэнзіі*, Мінск 2011, с. 157–163.

54 Пасля выдання кнігі паэзіі ў 2000 г. (Л. Галубовіч, *Апошнія вершы леаніда галубовіча*, Полацк 2000) публічна ўстрымліваўся ад паэтычнай творчасці да выдання новай кнігі паэзіі ў 2012 г. (Л. Галубовіч, *З гэтага свету. Вершы пасля вершаў*, Мінск 2012).

55 В. Маслюков, *Время и слово. О книге стихов Юрия Сапожкова „Точка невозврата"*, ИнтерЛит – международный литературный клуб [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.interlit2001.com/sapozhkov.htm, дата доступу: 05.12.2011: „Поэт, книгу которого вы держите в руках, Юрий Сапожков, десять лет молчал по обету. Переживая некую, известную только ему самому этическую вину, дал себе слово не писать. Не мыслить стихами".

56 І. Шаўлякова, *„Рэпутацыя" пасля (аўта)дыскваліфікацыі. Беларуская літаратурная крытыка 2000-х*, „Дзеяслоў" 2012, № 5, с. 326–330.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



су[57]; рубрыкі Л. Галубовіча ў газеце „Літаратура і Мастацтва" выклікалі шырокі розгалас у літаратурнай супольнасці, як і выхад кнігі крытыкі *Сыс і кулуары*.[58] Назвы рубрык Л. Галубовіча „ЛеГАЛізацыя" і „Кулуары" (2-я пал. 2000-х гг.) ілюструюць амбіцыйную скіраванасць аўтарскай стратэгіі: крытычны водгук аўтара рубрыкі „легалізоўвае" падлеглага крытыцы пісьменніка – паўнапраўна ўводзіць у літаратурны працэс; крытык-пісьменнік адкрывае чытачу праход за сцэну літаратурнага працэсу, у кулуары, дзе прыняты як свой сярод сваіх. Немагчыма адназначна выявіць, ці змена рэдакцыйнай палітыкі ў дачыненні крытыкі супадае з працай у выданні Л. Галубовіча, альбо апошні валодае здольнасцю збіраць таленавітых крытыкаў вакол пэўнага СМІ, аднак у час яго працы загадчыкам аддзела крытыкі штотыднёвіка „Літаратура і Мастацтва" ў штаце ўдалося аб'яднаць таленавітых крытыкаў (І. Шаўлякова, Ж. Капуста, Ц. Чарнякевіч, С. Дорская), а з пераходам Л. Галубовіча ў часопіс „Дзеяслоў" актывізаваліся крытычныя рубрыкі гэтага выдання (І. Шаўлякова, Н. Якавенка, Ю. Сальнікава, М. Весялуха, А. Лапіцкая, Дз. Марціновіч).

## Высновы

Уключэнне беларускай літаратурнай крытыкі ў рынкавыя механізмы рэгулявання літаратурнага працэсу (рэкламаванне, прамоцыю літаратурнай прадукцыі) абумоўлівае неабходнасць звароту пры вывучэнні крытыкі да тэрміналогіі маркетынгу, у прыватнасці, да катэгорыі стратэгіі поспеху. У крытыцы стратэгію поспеху мы вызначаем як аптымальнае ператварэнне таленту і працаздольнасці крытыка ў матэрыяльны і сімвалічны капітал, якое забяспечваецца пакрокавым выкарыстаннем абраных аўтарам сродкаў. Паводле хуткасці і доўгатэрміновасці эфекту стратэгій намі вылучаны дзве групы: стратэгія рызыкі і стратэгіі грунтоўных рашэнняў.

Двухкрокавая стратэгія рызыкі прадугледжвае выкарыстанне сродкаў культурнай правакацыі (эпатажу і літаратурнага скандалу) для хуткага ўваходжання крытыка ў медыйную прастору, а таксама мадэраванне публічнай дыскусіі (рэакцыі), спароджанай правакацыяй. Прыхільнікамі стратэгіі найчасцей з'яўляюцца маладыя крытыкі (М. Мартысевіч) і крытыкі-непрафесіяналы (водгукі падлеглых крытыцы пісьменнікаў, каментарыі чытачоў, рэпартажы і справаздачы журналістаў). Вонкавая простасць стратэгіі абумовіла пашыранасць літаратурна-крытычных правакацый, якая суправаджаецца іх дэвальвацыяй, выкліканай ускладненнем масавай камунікацыі (праблематычнасцю мадэравання дыскусіі). Стратэгія рызыкі спрыяе замацаванню негатыўнага вобразу крытыка, але і ўз-

57 Ю. Сапожков, *На просторе слова: критические статьи, эссе, диалоги*, Минск 2008.
58 Л. Галубовіч, *Сыс і кулуары: літаратурна-крытычныя эсэ*. Мінск 2010.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 13:11:54



багачае літаратурнае жыццё за кошт дыскусій, з'яўлення новых яго ўдзельнікаў, актывізацыі крытыкаў вакол абмеркавання пэўнай літаратурнай праблемы.

Шматкрокавыя стратэгіі грунтоўных рашэнняў уключаюць „белетрызаванае літаратуразнаўства", „асветніцкую крытыку", „сублімацыйную крытыку", а таксама персанажнасць як стварэнне фіктыўнай асобы, персанажа або маскі крытыка („свядомасная бландзінка" Г. Кісліцынай).

„Белетрызаванае літаратуразнаўства" (І. Шаўлякова, П. Васючэнка, І. Штэйнер) аб'ядноўвае навуковы аналіз літаратурных твораў са стварэннем займальнага крытычнага тэксту, у якім ужываюцца разнастайныя спосабы падтрымання чытацкай увагі. Стратэгія адпавядае традыцыйна ўніверсальнаму таленту беларускіх крытыкаў, а таксама дазваляе часткова пераадолець рэпутацыйны крызіс крытыкі.

„Асветніцкая крытыка" (Л. Рублеўская, А. Марціновіч, Д. Жукоўскі, П. Абрамовіч) прадугледжвае прывіццё навыкаў чытання беларускай літаратуры шырокаму колу чытачоў, выкарыстоўвае займальную форму для трансляцыі інфармацыі, якая павышае прэстыж (беларускамоўнага) чытання.

Стратэгію „сублімацыйнай крытыкі" ажыццяўляюць пісьменнікі, якія рэалізуюць творчую энергію ў жанры літаратурнай крытыкі (Л. Галубовіч, Ю. Сапажкоў, С. Балахонаў). Павышаная вобразнасць, падкрэсленая асобаснасць, дыялагічнасць і разняволенасць такой крытыкі робяць яе прыкметнай з'явай у літаратурнай прасторы.

Найбольш удалыя крытычныя выступленні спалучаюць сродкі абедзвюх вылучаных намі груп стратэгій. Разнастайнасць крытычных стратэгій сведчыць пра вялікі творчы патэнцыял крытыкаў, спрыяе павышэнню паспяховасці беларускай літаратурнай крытыкі ва ўмовах яе трансфармацыі.

**Summary**

The article explores the strategies implemented by Belarusian literary critics to overcome the reputation crisis, common decline of reading and reduction of Belarusian language usage.

The risk strategy employs the means of cultural provocation, shock and scandal to cause public discussion. Becoming popular with young or amateur critics in the 2000s, the risk strategy enriches the literary process with discussion, helps new critics to appear in mass-media and stimulates professional critics. Provocative means ensure immediate but temporary success of the critics.

A group of strategies create lasting effects on literary process. These are belletristic criticism (combines scientific analyses of literature with creative writing), enlightenment criticism (combines criticism with national enlightenment) and sublimation criticism (takes criticism for creative writing, is performed by writers).

Striving for individual success inseparable from Belarusian literature's prosperity, critics develop a diversity of strategies. That ensures successful transformation of Belarusian literary criticism.